Гарадская цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма г.Гродна;
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу і
рэкламы цэнтральнай бібліятэкі
імя А.Макаёнка



# "Музыка - маё жыццё"

## Кампазітар, педагог Я.К.Петрашэвіч: нарыс аб жыцці і творчасці

2009



# Петрашэвіч Яўген Канстанцінавіч (18.06.1930)

**Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, узнагароджаны ганаровымі граматамі Міністэрства культуры СССР і БССР, Вярхоўнага Савета БССР, граматай 1-га Усебеларускага фестываля самадзейнай творчасці працоўных (1975) і інш., дыпламант 6-га Міжнароднага фестываля народнай музыкі;**

**Уладальнік дыплома абласнога конкурса кампазітараў-аматараў Гродзеншчыны - за цыкл песень-балад на гістарычную тэму на вершы Яна Чачота (Гродзенскі клуб кампазітараў – аматараў);**

**Аўтар скульптур для літаратурна-краязнаўчага музэя ў Гудзевічах, аўтар надмагільных абеліскаў бацькам і роднай сястры;**

**Аўтар вакальна-харэаграфічных кампазіцый, музыкі да спектакляў, песень, рамансаў, гімнаў.**

***1955*** **- выкладчык музыкі, скончыў Мінскае музычнае вучылішча;**

***1955-1956*** **- акампаніятар Беларускай дзяржаўнай эстрады;**

***1956-1970*** **- выкладчык Гродзенскай музычнай школы (клас баяна, цымбал, аркестр народных інструментаў);**

***1970-1976*** **- кіраўнік аркестравай групы самадзейнага народнага ансамбля песні і танца “Нёман” г. Гродна;**

***1976-1981*** **- кіраўнік аркестравай групы ансамбля танца “Вянок” г. Гродна;**

***1981-1990*** **- кіраўнік аркестра народных інструментаў абласнога Палаца піянераў і школьнікаў;**

***1990-2002*** **- кіраўнік Узорнага фальклорнага ансамбля “Гарадзенскія дударыкі”.**

230009 Гродна
Урублеўскага 30.167
Петрашэвіч Яўген
Канстанцінавіч
т. 33.20.01

7.02 2005

Петрашэвіч

Выпіска з кнігі Хто ёсць хто
у Рэспубліцы Беларусь

WHO is WHO
in the Republic of Belarus
Энцыклапедыкс. Мінск




Вядомы беларускі фалькларыст
Р. Р. Шырма сказаў:
"Песня – душа народа"
Дазволю сабе дабавіць,
калі станем забываць
сваю родную песню – з'разу-
мела, будзе адміраць душа.
І мы усе павінны напэўна
быць рады і шчаслівы, што
нас нарадзіла маці на пя-
вучай прынёманскай зямлі,
на зямлі цудоўных песень
і надзвычайнай душы.

Яўген Петрашэвіч

**Петрашэвіч Яўген Канстанцінавіч - вядомы не толькі на Гродзеншчыне музычны педагог, аўтар вакальна-харавых і вакальна-інструментальных кампазіцый, шматлікіх песень, рамансаў, былы кіраўнік знакамітага Узорнага дзіцячага фальклорнага ансамбля “Гарадзенскія дударыкі”.**





# 1. Успаміны пра дзіцячыя гады

Яўген Канстанцінавіч Петрашэвіч нарадзіўся 8 чэрвеня 1930 года ў вёсцы Падбараны Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці. Багатая на яркія фарбы, маляўнічая прынёманская прырода падарыла будучаму кампазітару эстэтычнае светаадчуванне, спрыяла яго гарманічнаму развіццю. У адукаванай інтэлігентнай сям'і вельмі любілі народную музыку і песню. Любоў да яе выхавала ў маленькага Яўгена маці. Гэта і дапамагло яму знайсці сваё месца ў жыцці.

У маці Вольгі Васільеўны былі вялікія прыродныя здольнасці да іншаземных моў, да спеваў, да музыкі. Першы музычны інструмент, на якім Яўген Канстанцінавіч іграў, быў губны гармонік, які яму падарыла маці.





**Вёска Падбараны. Ля бацькоўскай хаты. Маленькі Яўгенік са сваякамі - з цёткамі Зінаідаю і Людмілаю, дзяцькам Іванам. 1937 год.**

***З успамінаў Яўгена Петрашэвіча***: "У маладосці маці хадзіла да Нёмана, не магла ніяк наспявацца. Гаварылі "кагосьці накрычыць"- накрычала мяне. Вольга Васільеўна была з роду Рамашкаў, скончыла гандлёвую школу ў Гродне, ёй дапамагаў бацька, (для мяне - дзед Рамашка Васіль). Дзед Васіль жыў у Амерыцы, быў цырульнікам, а потым меў уласную цырульню. Маці разам з бабуляй Фядорай была ў Амерыцы, але вярнулася з-за неспрыяльнага клімату."



***Пад гэтым небам нарадзіўся,***
***Матуля падарыла пачуццё.***
***І я любоў да роднай Беларусі***
***Нясу, як песню, праз усё жыццё.***
***(Я.К.Петрашэвіч)***

**Вольга Васільеўна, маці**



**Канстанцін Канстанцінавіч, бацька**

**Бацька Канстанцін Канстанцінавіч Петрашэвіч** у Харкаве атрымаў адукацыю і спецыяльнасць кваліфікаванага паштовага служачага.

Служыў начальнікам пошты ў Лунне (Мастоўскі р-н). У 1939 годзе з прыходам Савецкай улады яго перавялі на работу ў Гародню, на пасаду галоўнага бухгалтара абласной пошты. Па ўспамінах Я. Петрашэвіча, бацька прымаў удзел у конкурсе каліграфічнага напісання і атрымаў другую прэмію, таму што вельмі добра і прыгожа пісаў. Пры польскай уладзе працаваў са сваім старэйшым братам цесляром па традыцыях роду.

Бацька меў таксама матэматычныя здольнасці, быў строгім чалавекам і не раздзяляў захапленне сына музыкай. Па ўспамінах Яўгена Петрашэвіча, гэта быў "дзіўны чалавек, з дзіўным лёсам, калісьці іграў на гармоніку, вывучыў па нотах "Отче наш".

Бацькі Яўгена Канстанцінавіча былі рэпрэсіраваны, як агітатар і шпіёнка, за перапіску з матуліным бацькам Васілём і цёткамі Наталкай і Алесяй, якія жылі ў Амерыцы. Бацька - на 15 гадоў, маці - на 25 гадоў былі адпраўлены ў ссылку. У іх дом пасялілі жыць кэгэбістаў.

Бацька ў Ангарску, а маці ў Архангельску адбылі ў ссылцы па 5 год. Аднойчы Канстанцін Канстанцінавіч убачыў сон, у якім былі лічбы, якія ён потым запісаў на накрыўцы чамадана. Гэтыя лічбы і з'явіліся датай вызвалення бацькоў. Пасля вяртання на Радзіму бацькі былі рэабелітаваны.

Бацька памёр у 1979 годзе, маці - ў 1976.

***З успамінаў Яўгена Петрашэвіча:*** “У мяне была мянушка «лупаты» за маю асаблівую прыхільнасць да губнога гармоніку. Жалезныя дэталі гэтага інструмента нагадвалі мне фальгу з-пад шакаладу. Калі я іграў, я адчуваў асалоду ад гукаў. У дзіцячым узросце я любіў ствараць аркестры з мясцовай дзетвары, дзе іграў на губным гармоніку. Пазней навучыўся іграць на баяне. Музычнай была наша сям’я. Дзядзька Грыша іграў на гармоніку, прадзед- на скрыпцы, а мая маці Вольга і сёстры Люда і Зіна - спявалі. Людзі сходзіліся, слухалі, дзівіліся і плакалі. Гэта асяроддзе народнай музыкі, напэўна, аказала на мяне значны ўплыў... .

Быў у нас у вёсцы Жоржык Троцкі, дужы хлопец, іграў на губным гармоніку, ад яго навучыўся і я. Так старанна дзьмуў, што губы калачом паўставалі. Дастане Жоржык губны гармонік - і як дасць жару! А бацька Жоржыкаў - Алесь Троцкі - меў бас. Дзядзька Антось з хутара быў майстра выштукоўваць мелодыю на дудцы. І тыя дудкі рабіць мастаком быў. Я ў яго навучыўся...

Збіраліся надвячоркам вяскоўцы на беразе Нёмана і так душэўна спявалі, што падарожныя на лодках прыпыняліся, каб паслухаць. На цеплаходах “Баторый” і “Ягела” пасажыры згрудзяцца на палубе, прыветна махаюць рукамі. Далёка ў наваколлі чуліся песні, відаць, даганялі сонца, якое нібыта наўмысна прымаруджвала хаду на небасхіле. Патэфоны, гітары, музычныя інструменты, цэлыя спектаклі, у якіх і я прымаў удзел. Памятаю, паказвалі, як клякочуць буслы, як гаўкае сабака, як квакае жаба. З дзяцінства памятаю і ўкраінца Сямёна Крывашэя. Майстра быў на розныя штукі, рабіў цудоўныя куфэркі. Дзякуючы яму я меў магчымасць асвоіць украінскія песні, як свае. Вось дзе была мая кансерваторыя!”.

Аднойчы Яўгену прыйшла думка: мала проста дыхаць, трэба выдыхаць паветра разам з песняй. Ён ішоў звычайна са школы і напяваў сабе якую-небудзь мелодыю, дзе ляскание зубамі замяняла музычны акампанемент.

Яўген Канстанцінавіч прызнаўся, што спецыяльна рабіў на дыктантах у школе памылкі, перакручваў словы, каб настаўніца выпраўляла. Да спадобы была чырвоная туш, што так расквечвала сшытак. Ніколі не любіў сшыткі ў клетку, а лічбы ў яго мелі сваё асаблівае жыццё. Напрыклад, адзінка бачылася яму, як чалавек с грыўкай, двойка - лебедзем, тройка - гарбуном, чацвёрка была стулам са спінкай, сямёрка - касой. Ён іх пераварочваў, і, калі рашаў задачкі па матэматыцы, інтуітыўна ўгадваў правільнае рашэнне.

Калі была нямецкая акупацыя, Яўген не меў магчымасці вучыцца ў школе.



**Канстанцін Канстанцінавіч каля хаты. 1975г.**

# 2. Вучоба, мары юнацтва, дасягненні

“Ігра на губным гармоніку, стварэнне шумавога аркестра з удзелам вясковай дзятвы, пад які танцавалі вечарам дарослыя, захапленне пераймannем гукаў птушак, звяроў, тарабарскай моваю далі магчымасць ў далейшым ствараць складаныя музычныя партытуры. Свет непазнавальны да канца, таму так цікава жыць і звяртацца да сваіх першакрыніц,”- так па-філасофску адказаў Яўген Канстанцінавіч на пытанне, што аказала на яго ўплыў, каб усё сваё жыццё прысвяціць музычнай творчасці.



Бацька і сын Петрашэвічы. 1978 год.

Ці талент бацькоў, ці прыгожая прынёманская прырода ўзнагародзілі сціплага і працавітага хлопца магчымасцю ствараць і выконваць на дудцы, жалейцы, баяне і многіх іншых інструментах непаўторныя мелодыі?

***Яўген Канстанцінавіч разважае:*** “Практычна я самавукам налаўчыўся іграць на гармоніку, баяне, дудцы. Усё спасцігаў самапасам, мелодыю падбіраў на слых. Але надзвычай хацелася даведацца, як складаецца песня. Нотны стан здаваўся мне чымсьці недасягальным і мудрагелістым. Куды працей было паслухаць мелодыю, а пасля ўзяць гармонік ці баян і ўзнавіць яе. Упартым быў: пакуль не вывучу, не адступлюся!”



Яўген Петрашэвіч з сястрою і яе мужам. Лістапад,1952г.

Карысць для музыканта была таксама ў тым, што баяністаў у тыя студэнцкія часы ахвотна бралі на кватэру. Іншы недарэка ногі пазбівае, шукаючы пакой. А калі гаспадар ці гаспадыня пабачыць на тваім плячы гармонік альбо баян - няма праблемы. Праўда, граць будзеш, калі папросяць. Можаш урокі прапусціць, але не думай адмовіцца.

Мой бацька не раз казаў мне: “Музыкант будзе п’яніцай”. Я даў зарок - буду музыкантам, але п’яніцам ніколі не стану. З таго часу я не здраджваю музыцы, яна не здраджвае мне.”

Пачатковую школу Яўген Канстанцінавіч скончыў у мястэчку Лунна (Мастоўскі р-н).

У 1939 пераехалі ў Гродна. У 1949 скончыў 9-ты клас СШ №8. Адначасова вучыўся ў Гродзенскай музычнай школе па класу баяна, а затым паспяхова скончыў Мінскую музычную вучэльню імя М.Глінкі па спецыяльнасцях баян і дырыжыраванне. Музыка становіцца сэнсам яго жыцця.



Яўген Петрашэвіч.
2 ліпеня 1944 г.

***З успамінаў кампазітара:*** "У пачатку 50-х гадоў я вучыўся ў Мінскай музычнай вучэльні. Для мяне той час прынёс шмат гора: рэпрэсіравалі бацькоў. Мяне з трэцяга курса прызвалі ў войска (1950-1953 гг.). Вучоба, такім чынам, расцягнулася з 1949 па 1955 год. Але, затое, я вучыўся кампазіцыі ў прафесараў Мікалая Аладава і Яўгена Глебава. Быў знаёмы з Генрыхам Вагнерам. Аднойчы паказаў Вагнеру мелодыю, ён папрасіў яе ў мяне. Гэта мелодыя "Ціхі вечар" потым прагучала на творчым вечары Вагнера. Гэта была мая мелодыя. Я ніколі не выкарыстоўваў чужыя мелодыі, але, калі выкарыстоўвалі мае, злосці не трымаў. Таму што браць – адмоўная энергія, даваць- дадзеная, як месяц і сонца.

Адну з першых песень "Нарачанскія сосны" на словы Авяр'яна Дзеружынскага паказаў Генадзю Цітовічу. Пасля гэты твор спявалі Шыманскі і Юневіч (хто б мог падумаць!) з мужчынскай групы народнага ансамбля "Нёман".

У мяне існуе дзве біяграфіі: адна - тая, якую пра мяне складаюць у кнігах, другая- тая, што жыве ў маёй памяці. Людзі рана ці позна думаюць пра цябе так, як ты думаеш сам пра сябе."

# 3. Гродзенскі перыяд




*Мужны Гарадзень,*
*Прыгажуня Гародня.*
*Мілае Гродна,*
*Горад мой родны.* ( Я.К.Петрашэвіч)

Пасля вяртання ў Гродна Яўген Петрашэвіч вёў актыўную творчую і педагагічную дзейнасць. На працягу 14 гадоў працаваў ў Гродзенскай музычнай школе №1 імя Ю. Семянякі (1956-1970), дзе некалі сам вучыўся: выкладаў ігру на баяне і кампазіцыю, адкрыў клас цымбал, арганізаваў інструментальны квінтэт, з якім паспяхова выступаў ў Мінску і Беластоку.

***Успаміны Яўгена Канстанцінавіча***: “У гэты час я напісаў “Інтэрмеца” з тым разлікам, што, калі твор прымуць, то гэта стане для мяне сігналам пайсці вучыцца на клас кампазіцыі. Калі твор прагучаў на радыё, то пры гуках першага акорда я перастаў дыхаць ад хвалявання. Такое можна параўнаць з тым, калі ты ідзеш па сходках, а яны скончыліся, і ты правальваешся ў бездань...”.

Калі мяне пыталі: “Чаму ты так заўзята займаешся са сваімі вучнямі? ”, - я адказваў: “Хачу, каб гэта дзяўчына калі-небудзь прывяла да мяне сваіх унукаў”.

Адначасова Яўген Канстанцінавіч кіраваў аркестравай групай народнага ансамбля песні і танца “Нёман” (на працягу 5-ці гадоў), затым – аркестравай групай народнага ансамбля танца “Вянок” (таксама 5 гадоў).



**Кампазіцыя “Залатыя каласы” у выкананні ансамбля песні і танца “Нёман”**



**Ірына Суворава, Яўген Петрашэвіч, Ларыса Ляшэнка ў час паездкі ансамбля “Нёман” у Маскву. 1963г.**

У 1972-1974 гадах быў кіраўніком хору Аблсаўпрофа ў Гродне. Ён сам не заўважаў, як рос творча, як паглыбляўся яго талент і ззяў яркімі гранямі.

У гэтыя гады Я. Петрашэвіч піша вакальна - харэаграфічную кампазіцыю “Залатыя каласы” на словы вядомага паэта-песенніка Анатоля Астрэйкі. Яна набывае шырокую вядомасць – яе чулі ў розных кутках Беларусі, Польшчы, у шматлікіх гарадах былога Савецкага Саюза. У пастаноўцы ансамбля песні і танца “Нёман” яна была паказана на сцэне Крамлёўскага Палаца з’ездаў у Маскве і мела значны поспех.

“Залатыя каласы” - гэта глыбока лірычны карагод, як шчырая хвала хлебу, багатаму ураджаю, руплівым рукам хлебаробаў, з вялікай прыемнасцю пабачылі ў горадзе Ваўкавыску на свяце “Дажынкі-2004”, а таксама на юбілейным вечары аўтара ў 2005 годзе.

З 1975 года Я. Петрашэвіч кіруе аркестрам народных інструментаў абласнога Палаца піянераў і школьнікаў (дзіцяча-юнацкай творчасці).

У 1977 годзе на словы гродзенскай паэтэсы Д. Бічэль-Загнетавай напісаў лірычную песню “Бярозанька”, якая таксама набыла шырокую вядомасць.

***З успамінаў Яўгена Петрашэвіча:***

“Колькі за скупымі радкамі ўласнай біяграфіі падзей! Добра, што маімі дарадчыкамі сталі вядомыя гродзенцы Аляксандр Шыдлоўскі, Адам Чопчыц, Апанас Цыхун, шмат хто з мясцовых паэтаў - Міхась Васілёк, Ларыса Геніюш, Міхась Губернатараў, Людміла Кебіч, Уладзімір Шурпа, Міхась Мельнік, Уладзімір Васько.

Сваімі здабыткамі лічу карагод “Залатыя каласы”, кантату “Гродна, родны мой горад”, “Ласкавую песню” (прысвечана А. Карпюку), “Хай зязюлька сто год накукуе” (адрасавана А. Шыдлоўскаму, А. Чопчыцу), “Ручнічок” (на словы Я. Насуты) і “Вяснянка беларуская” і іншыя. Многія творы напісаны на ўласныя вершы”.

## 4. “Гарадзенскія дударыкі”




Яўген Канстанцінавіч паступова прыходзіць да высновы, што аматары музычнага мастацтва жадаюць бачыць і слухаць блізкую ім па духу народную музыку, у якой адлюстроўвалася б жыццё з яго гаротнасцю і весялосцю. Па гэтай прычыне Яўген Петрашэвіч і вырашае стварыць свой дзіцячы фальклорны ансамбль.

У 1980 годзе ў Палацы дзіцяча-юнацкай творчасці быў арганізаваны фальклорны ансамбль “Гарадзенскія дударыкі”.

Узнікалі цяжкасці ў падборы рэпертуару. Фактычна фальклорных дзіцячых твораў не многа. Кампазітару даводзілася выязджаць у вёскі і збіраць па крупіцах творы народнага музычнага мастацтва. Яўген Канстанцінавіч не раз успамінаў словы вядомага фальклярыста В. Раговіча: “Калі фальклор не будзе развівацца, мы загінем”. І гэтыя словы падтрымлівалі яго ў цяжкую хвіліну, давалі сілы працаваць.

***З успамінаў Яўгена Канстанцінавіча:*** “Гэта было вяртанне ў дзяцінства. У Палацы дзіцяча-юнацкай творчасці знайшлася група здатных дзяцей, з якімі мы спрабавалі рабіць фальклорныя кампазіцыі з дудачкамі, скрыпачкамі, цымбалікамі. І тут я адчуў, што, нібы праз павелічальнае шкло, бачыцца маё юнацтва, чуюцца адгалоскі даўнейшых найгрышаў. Учапіўся за гэта, як за выратавальны круг. Зразумеў, што можна стварыць асобную фальклорную групу і адрадзіць дух народных святкаванняў, напрыклад, Каляд, Купалля, маючы атрыбуты гэтага - “Казу”, зорку, папараць-кветку... Пачаў вызначаць тых, хто мог пачуць і перадаць вясковы характар твора.

Неяк правялі рэпетыцыю, і я пераканаўся, што не прагадаю. Даводзілася вырашаць масу праблем. Знайсці спонсараў на шыццё вопраткі, абутку. Майстраваць атрыбуты (калядная зорка, лапці, саламяныя маскі і іншае). Навучыць звычайных дзяцей без спецыяльнай музычнай падрыхтоўкі быць вольнымі, граць, спяваць, прытанцоўваць і ўсё гэта разам - была цяжкая справа. Удзельнік ансамбля Андрэй Шыдла сказаў з цягам часу: “Я пяць гадоў не разумеў, што вы ад мяне хацелі”.



**“Гуканне вясны” у выкананні “Гарадзенскіх дудярыкаў” каля Палаца дзіцяча-юнацкай творчасці. 1993г.**

Наладзіў тут парадак, як у сям’і. Дзеці ж рознаўзроставыя. Малодшыя апякоўваюцца старэйшымі. Кожны мае сваю канкрэтную дзялку, як ролю ў гульні.

Калісьці мая бабка Фядора не вымушала мяне сілком займацца спевамі і гармонікам, а наладжвала цэлыя спектаклі. Цікава было!

З цягам часу гэтая групка вырасла ў самастойны ансамбль, у склад рэпертуару якога ўвайшлі песні, танцы, найгрышы каляндарна-абрадавага

цыклу. “Дударыкі” выраcталі з маім творчым станаўленнем. У рэпертуар уваходзілі некалькі блокаў: калядкі, вяснянкі, купальскія песні, патрыятычны і забаўляльны блок, а таксама “інтэрнацыянальныя“ песні. “Інэрнацыянальныя”- гэта калі мы ездзілі ў якую-небудзь краіну, то абавязкова спявалі іх песню. Так, у нас была нямецкая песня пра вясну, англійская -“Капітан”, нарвежскі “Вальс” Э. Грыга, французская “Сурлепо”, а таксама песні ўсіх нашых суседзяў.

Канцэрты “Дударыкаў” у розны час адбываліся ў Літве, Польшчы, Францыі, Швецыі, Нарвегіі. Пабывалі у многіх кутках Беларусі, але найбольш радавалі Гродзеншчыну. Як самы прыемны ўспамін трымаю ў памяці словы жанчыны з райцэнтра Воранава. Мы там удзельнічалі ў канцэрце. Неяк па завядзёнцы проста на вуліцы зайграў на дудачцы. І пачуў: “Глядзіце, глядзіце! Наш дударык ідзе!” .

У ансамблі спачатку было 20 дзяцей: 15 хлопчыкаў і 5 дзяўчынак (рознага ўзросту). Таму падбор рэпертуару быў больш разлічаны на хлопчыкаў. У інструментальны склад ўваходзілі: дудка, жалейка, аккарына, гармонік, ударныя інструменты, цымбалы, скрыпка, кантрабас, а ў дадатак спевы і прытанцоўкі.

Акрамя творчай работы ў калектыве склаліся і свае традыцыі. Кожны год “Дударыкі” разам з маёй сястрой Ірынай віншавалі са святам “Калядкі” усіх настаўнікаў і гурткоўцаў Палаца”.



**Яўген Петрашэвіч з сястрою Ірынай**

Калі прыходзіла вясна, “Дударыкаў” запрашалі ў Новы Замак, каб разам адсвяткаваць “Гуканне вясны”. Колькі радасці і вяселля прыносіць вясна сваімі песнямі, танцамі, былінамі, смехам і гумарам!

У калектыве ансамбля праводзіліся дні імянінніка. У арганізацыі гэтага свята дапамагалі бацькі гурткоўцаў. Штогод у верасні адбывалася ўрачыстае пасвячэнне ў гурткоўцы фальклорнага ансамбля “Гарадзенскія дударыкі”.

“Дударыкі” былі частымі і жаданымі гасцямі у кожнай школе і бібліятэцы, на гарадскіх святах са сваімі творчымі праграмамі. Напрыклад, на свята беларускага пісьменства і друку, якое праводзіла Гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, часта запрашаўся і калектыў “Гарадзенскія дударыкі”.

У Яўгена Петрашэвіча перапляліся два таленты - педагога і кампазітара. Гэта станоўча ўплывала на сяброўскія ўзаемаадносіны паміж настаўнікам і вучнямі, а таксама дапамагала развіццю гурткоўцаў, як духоўна, так і творча.

Дзякуючы намаганням мастацкага кіраўніка Яўгена Петрашэвіча і дырыжора ансамбля народных інструментаў Ірыны Белавусавай, у 1993 годзе фальклорнаму калектыву “Гарадзенскія дударыкі” было прысвоена Ганаровае званне “узорны”.

У 1994 г. Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь запрасіла ансамбль на першы Міжнародны фестываль фальклору на Беларусі, дзе калектыў быў узнагароджаны Дыпломам (Пінск-Мінск-94).

Неаднаразова фальклорны ансамбль “Гарадзенскія дударыкі” узнагароджваўся дыпломамі і граматамі абласнога аддзела народнай адукацыі і упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, граматамі гарвыканкама. Калектыў - часты госць на абласным радыё і тэлебачанні.

## Першы састаў ансамбля “Гарадзенскія дударыкі”:

1. ***Васільчык Павел***
2. ***Заяц Данік***
3. ***Капуста Андрэй***
4. ***Крамушчанка Віталь***
5. ***Палеха Аляксандр***
6. ***Палавінчыкаў Уладзімір***
7. ***Шыдла Вольга***
8. ***Шыдла Андрэй***
9. ***Шыдла Кастусь***
10. ***Бурлыка Сяргей***
11. ***Іоська Ганна***
12. ***Салаўёў Аляксей***
13. ***Бандаровіч Дзмітрый***
14. ***Крупскі Сяргей***
15. ***Кашэта Алесь***
16. ***Лысюк Сяргей***
17. ***Шчука Крысціна***
18. ***Гняцецкі Андрэй***
19. ***Петрашэвіч Аляксей***
20. ***Канішчава Вольга***

У рэпертуары ўзорнага калектыву “Гарадзенскія дударыкі” у перыяд 1980-1995 гг. былі падрыхтаваны наступныя **блокі народных песень:**

- **“Калядкі”**

Беларускія народныя песні: “У нядзелю рана”, “На новыя лета”, “Ой, на моры, моры”, “Хадзі бабка каля печкі” і калядкі на словы і музыку Я.К.Петрашэвіча - “Дзядзька Васілю”, “Батлеемска зорка”, “Ідзе, ідзе Каляда” і іншыя.



**“Гарадзенскія дударыкі” калядуюць. 2001 г.**

- **“Вяснянкі”**

Песні на словы і музыку Я.Петрашэвіча “Прылятaлі жаваронкі”, “Вясна-красна”

- **“Купальскія”**

-бел.нар.песня “Ой, рана на Івана”

-песня на словы і музыку Я.Петрашэвіча “Радуйся, Купалінка”, “Папараць-кветка”.

- **Патрыятычны блок:**

“Трубы гарадзеньскія” (кампазіцыя);

-Пазыўныя на жалейках;

-беларуская народная песня “Гэй, у нашым горадзе”;
-песня “Конік-Варанок” (муз. Я.Петрашэвіча, сл. Я.Насуты)
-песня “Гайда, гайда, вараненькі”(сл. і муз. Я.Петрашэвіча)
-песня “Як у горадзе Міры”(муз.народная,сл. Я. Петрашэвіча)
-песня “Ішлі салдацікі”(сл. і муз. Я.Петрашэвіча)

## ○ “Забаўляльны блок”

-“Полечка ха-ха-ха” (сл. і муз. Я.Петрашэвіча);

-беларускія народныя песні “Як радзіўся Сымон”,“Дудары, дударыкі”, “Гэй, ды ў бары”, “А ў полі ніўка”, “Мясцовы вальс” ў апрацоўцы Я.Петрашэвіча;

-польскія народныя песні “Естэм собе Краковянка”,“Вэндровалі шэвцы”;

-песня “А хто там ідзе?” (сл. Я.Купалы), “Марш добрым людзям на здароўе” (муз. Я. Петрашэвіча);

-нямецкая песня пра вясну, англійская песня “Капітан”, французская песня і інш.

**Выступаюць “Гарадзенскія дударыкі”**






“Гарадзенскім дударыкам”- 10 гадоў.
Юбілейная вечарына ў гарадскім Доме культуры (14.05.1998 г.)

## Верш Я.К. Петрашэвіча да 10-гадовага юбілею ансамбля “Гарадзенскія дударыкі”

**Гарадзеньскія Дударыкі-**
**Вясёлыя тварыкі.**
**Дзесяць год спявалі, гралі,**
**Юбілею дачакалі.**

**Хвала вам, Дударыкі,**
**Вясёлыя тварыкі.**

**Колькі раз мы выступалі,**
**Нам цукерачкі давалі.**
**Стараліся пільна**
**Дударыкаў зьмена.**
**Дзякуй цётачцы Ірыне**
**І дзядзьку Яўгену.**




За сваю творчую дзейнасць калектыў быў узнагароджаны паездкамі за мяжу, з’яўляўся ўдзельнікам канцэртаў народнай музыкі ў Рэспубліцы Польшча (1989г. - г. Бельск Падляска), Францыі (1998 г. - г. Брыў), Швецыі (2001 г. - г. Норсберг, канцэрт для дзяцей дыпламатаў розных краін), Нарвегіі (жнівень, 2000 г.).

“Дударыкі” пабывалі на Першым Міжнародным фестывалі фальклору (Пінск-Мінск, 1994 г.), фестывалі “Сымон-музыка” ў Стаўбцах, на месячніку Еўрапейскай культуры ў Кракаве (1992 г.), з Калядным канцэртам ў Вільнюсе (1996 г.).



# 5. Гастролі, паездкі, канцэрты…

## 1995 год. “Гарадзенскія дударыкі” ў Францыі



*З успамінаў Я.К. Петрашэвіча*: “Першае сур’ёзнае міжнароднае выпрабаванне ўзорны фальклорны гурт “Гарадзенскія дударыкі” атрымаў на XII Міжнародным фестывалі “Аркестрына”, які праходзіў у французскім горадзе Брыў у 1998 годзе. Трынаццаць аркестраў, семсот юных музыкантаў з краін Еўропы, Амерыкі, Афрыкі - вось што ўяўляў сабою дванаццаты фестываль.

Кампазітар і дырыжор Жак Пеці пры выкананні сваёй кампазіцыі “Мора” пасадзіў беларускіх музыкаў, апранутых у свае нацыянальныя касцюмы, у цэнтры ўсяго зводнага аркестра з сямісот выканаўцаў. “Дударыкам” ён даручыў пачаць кампазіцыю, а таксама выканаць яе завяршальную частку.

Вялікую цікавасць выклікалі беларускія інструменты. У час канцэрта тэлекамеры ўвесь час трымалі ў аб’ектыве цымбалістку Вольгу Канішчаву.

У тым жа фінальным канцэрце Жак Пеці прапанаваў для выканання п’есу пад назвай “Ча-ча-ча”. Беларусам даручылі выканаць сольную ўстаўку. І яны з вялікім задавальненнем і вельмі паспяхова спявалі і ігралі”.



**Канцэрт для мадам Паўрыерас з горада Лімож, якая сустракала “дударыкаў” у час знаходжання на XII Міжнародным фестывалі “Аркестрына” (г. Брыў)**

# 2000 год. “Гарадзенскія дударыкі” ў Нарвегіі

*З успамінаў Я.К.Петрашэвіча*: “Гарадзенскія дударыкі” прымалі ўдзел у міжнародным гала-канцэрце “Тварам да твару з нашым светам”, які праводзіўся ў рамках фестываля “Трандэлаг-2000” у Нарвегіі. “Дударыкі” далі 17 канцэртаў - у дамах для састарэлых і хворых, у гарадской Радзе (мэрыі), на пляцоўках выставы Трандэлаг-2000, у культурным цэнтры Стыкльстад - месцы гістарычнай бітвы вікінга Олафа, які стаў каралём Нарвегіі.

У апошні дзень прыбывання – нядзелю - “Дударыкі” наведалі Трандхейм, прысутнічалі на экуменічнай службе ў храме Нідарос, дзе пахаваныя нятленныя мошчы св. Олафа, а таксама ўдзельнічалі ў забаўляльнай праграме ў музеі музыкі Рынгве, заснаваным, дарэчы, рускай жанчынай. Арганізатарам гэтай цікавай паездкі стала старшыня грамадскага аб’яднання сяброўства “Нарвегія-Беларусь” Сванхільд Валстадс, настаўніца англійскай мовы, адміністратар школы, кіраўніца таварыства дружбы “Паўночны Трандэлаг - Мінск”. Гэта незвычайная жанчына, пра якую шмат пісала і беларуская, і нарвежская прэса, сваім добрым сэрцам сагрэла многіх беларусаў. І для “дударыкаў” яна была, як вельмі клапатлівая маці.



**Адзін з канцэртаў у Нарвегіі (2000 г.)**

Галоўнай культурнай імпрэзай мерапрыемства ў Нарвегіі стаў сямігадзінны міжнародны гала-канцэрт “Тварам да твару з нашым светам” пад лозунгам “Маладое пакаленне - за лепшую будучыню”. У ім выступалі скандынаўскія калектывы, а таксама музыкі з Ірландыі, Балгарыі, вострава Марцініка.

Нашыя “Дударыкі” здолелі ўпісацца ў відовішча сучаснай рок-музыкі са сваёй праграмай - цыклам “Поры года”. Зала- вялізны авіяцыйны ангар - бурна рэагавала на любую песню, ці то веснавую, ці то жніўную. А “Вальс” Эдварда Грыга, знакамітага нарвежскага кампазітара, стаў прыемнай нечаканасцю для слухачоў.

А калі перакладчыца групы ўручыла аргкамітэту пару саламяных лялек - беларусачку і беларуса, як сімвал надзеі на лепшы свет, са словамі “Дзякуй, Нарвегія”, маладыя нарвежцы высока ацанілі гэты жэст адпаведна з іх пачуццямі здаровага інтэрнацыяналізму...



Яўген Петрашэвіч са сваім любімым гармонікам

Да таго ж, нашы прыгожыя, у нацыянальным адзенні хлопчыкі і дзяўчынкі вызначаліся ў мнагалюдным па колькасці ўдзельнікаў аглядзе–конкурсе, які праводзіўся ў рамках выставы “Трандэлаг-2000”, і занялі прэстыжнае другое месца з выплатай значнай грашовай прэміі.

Праз “Гарадзенскія дударыкі” прайшло не адно пакаленне дзяцей. Самыя здольныя з іх паступілі ў музычныя ўстановы. Але гонар Яўгена Петрашэвіча - тыя знакамітыя людзі, якія пачыналі свой музычны шлях з яго ўдзелам. Гэта - заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь кампазітар Леанід Захлеўны, кампазітар Віктар Войцік, вядомы баяніст-выканаўца Уладзімір Навасадаў, музыкі-творцы браты Фадзіны і іншыя.

“А сакрэты? Якія там сакрэты! Трэба шчыра любіць сваё, роднае, разумець дзяцей і з замілаваннем ставіцца да той справы, якую абраў. Дзеці гэта адчуюць, іх немагчыма падмануць”, - так адказвае Яўген Канстанцінавіч на пытанні пра сакрэты поспехаў.

# 6. Свет захапленняў



Яўген Канстанцінавіч піша вершы, так неспакойная душа яго шукае самавыяўлення. Ён сабраў вершы розных гадоў, падзяліў іх тэматычна. Галоўная частка - любімы край. Астатнія таксама гавораць за сябе: эўрыка, патаемнае, жалобнае, інтымнае, карацелькі, пацешкі, байкі. Уключыў і свае ўражанні ад замежных вандровак. Кніга вершаў мае назву “Пасынкі”.

Аднойчы Яўген Канстанцінавіч бачыў сон, у якім старэйшы брат бацькі вымавіў усяго адну фразу: “Сымкні калітку”. Ён сапраўды потым пачуў гэтыя словы. Адна з жанчын казала “Сымкні калітку”, калі хавалі яго пляменніка Пятра. Сон збыўся, і пад ўражаннем гэтага быў напісаны верш “Хаваюць сёння беларуса”:

Хаваюць сёння беларуса,
Як пасланца ў свет нябачны,
І так, ці гэтак, не іначай,
Аддзеліцца душа ад цела,
Як з вогнішча аддзеліцца ахвярны дым.
Наколькі цяжка тут было на сьвеце белым,
Настолькі лёгка будзе ёй на свеце тым?
О, Госпадзе, Ісусе!,
Хаваюць сёння беларуса
Господзь, будзь міласьціў,
Дапамажы знайсьці спакой яго душы....

1998 г.

У свой час Яўген Канстанцінавіч захапляўся тым, што майстраваў дудачкі. З хатняй калекцыі ён дастае некаторыя з іх і іграе лепшыя свае мелодыі. Яшчэ ў яго ёсць цікавы самаробны інструмент - свістулька, які стварае цудоўныя гукі. На такіх свістульках ігралі калісьці плытніні, якія сплаўлялі лес на Нёмане. Яўген Канстанцінавіч здагадаўся, як свістулькі былі зроблены. Ён аднойчы паспрабаваў змайстраваць такую, а потым гэта стала яго захапленнем.



**Каля ўласнага партрэта з самаробнай дудачкай. 2005 год.**

Мар'ян Скрамблевіч пад уплывам Яўгена Петрашэвіча заняўся вырабам дудачак больш сур'ёзна. Мар'ян Скрамблевіч быў удзячны, што менавіта сябра Яўген Петрашэвіч рэкамендаваў яму паехаць у Паставы, каб пазнаёміцца з майстрамі з усёй Беларусі. Зараз Мар'ян Скрамблевіч - знакаміты музыка, разьбяр па дрэву, які змайстраваў шмат самаробных дудак.

Захапленне скульптурай займае асобнае месца ў жыцці Яўгена Канстанцінавіча. У Даніі за драўляную скульптуру "Вікінг" Я.К. Петрашэвіч атрымаў узнагароду - ордэн "Вікінг".

Яго рукамі зроблены абеліск з шэрага граніту з партрэтам сваёй маці. У 2000 годзе памерла любімая сястра кампазітара, Ірына Канстанцінаўна Петрашэвіч (1932-2000 гг.).

На добрую памяць пра яе Яўген Канстанцінавіч вырубаў абеліск з граніту, што знайшоў ля рэчкі Гараднічанкі, а крыж выкаваў знакаміты каваль Юрась Мацко. Усе, хто бачыў абеліск, захапляліся гэтым творам мастацтва. У час працы асколкі упіліся у ногі майстра, але ён не адчуваў болю, апантаны не заўважаў. У якасці напаміну засталіся рубцы ад ранаў, зробленыя гранітнымі асколкамі. На помніку напісаў словы:

Як вянок роспачы,
Надарваліся струны душы маёй ліры,
І заціх на паўслове сумнай роспачы сьпеў..
Усё жыццё я любіў цябе моцна, сястрыца Ірына,
Толькі слова "люблю" так і сказаць не паспеў...

У Яўгена Канстанцінавіча таксама ёсць свой камень у выглядзе чалавечага следу, бо кожны чалавек павінен пакінуць пасля сябе след на гэтай зямлі, - так лічыць кампазітар. Ён сімвалічна ўбачыў у гэтым граніце знак для сябе, і зараз працуе з камнем, надаючы яму патрэбныя формы.

У 1990 годзе зрабіў каменны помнік, які ў абхопе мае больш за чатыры метры. Выбіў прыгожыя ўзоры, выразаў словы "Гудзевічы" і "1539 год"- час упамінання вёскі ў даўняй грамаце.

Захапляецца ён таксама саломапляценнем, выцінанкай. У майстра многа вялікіх і сярэдніх па памерах саламяных капялюшаў, якія насілі нашыя продкі, ёсць і лапці.

Мара майстра Яўгена Петрашэвіча - зрабіць цацкі, якімі бавіліся ў дзяцінстве, і падарыць Гудзевіцкаму дзяржаўнаму літаратурна-краязнаўчаму музею.

Вось такі цікавы чалавек, прыгожы тварам і душой, жыве і працуе ў Гродне. Са шчырай усмешкай ідзе ён па жыццёвых сцежках, выпраменьваючы шчодры талент і сыноўнюю любоў да Беларусі праз цудоўныя, непаўторныя творы мастацтва.

# 7. Фотаздымкі з асабістага архіву:

## Яўген Канстанцінавіч- госць сваіх сяброў ў Англіі летам 2005 года



Рэха вякоў. Яўген Канстанцінавіч ля руінаў англійскага замка



Каля драўляных скульптур “Лесавічок”і “Рог”, зробленых у Англіі, у двары хаты сваёй сяброўкі Таццяны Антонаўны, сястры былога вучня Віктара Войціка (кампазітара)



“Ніхто не можа нам перашкодзіць рубаць камень, як раб і думаць як творца” (Яўген Петрашэвіч)

“Бясконцасць - гэта вечнае блуканне па лабірынту заўчаснасці чалавецтва і невядомасці” (Яўген Петрашэвіч)





“Ніхто не перашкаджае вязьню марыць і думаць аб свабодзе і волі”
(Яўген Петрашэвіч)



Ля помніка Гуліверу.
Англія. 2005год.





Прырода натхняе на творчасць...



Майстру любыя
інструменты
пакараюцца...



**Дома.**
**Яўген Канстанцінавіч іграе на дудачцы**
**і расказвае пра сябе...**

# 8. Успаміны і прысвячэнні

## "Я ўдзячная лёсу"



***Яўген Канстанцінавіч Петрашэвіч не проста цікавы чалавек. Ён таленавіты ва ўсім. І не разменьвае свой талент на дробязі, а, калі стварае музыку, то велічную, кантатную, песні - цэлыя кампазіцыі. У вершах і вершанятах сваіх абавязкова знойдзе такое народнае трапнае слоўца, як ні ў кога. А захоча разьбярствам заняцца, дык не толькі дрэва, але вялізны камень-валун яму падавай!***

***Але самы галоўны талент Петрашэвіча - быць чалавечным чалавекам, жыць з людзьмі па-людску. Не чула, не ведаю, ніводнага чалавека, з якім ён сутыкаўся на сваім доўгім жыццёвым шляху, каб быў ім пакрыўджаны, зняважаны, ахаяны. Да людзей Яўген Канстанцінавіч ставіцца паважліва, ідзе да іх з адкрытаю душою, бо гэтай душы ёсць што даць людзям, ёсць што сказаць ім, чаму навучыць.***

***Я вельмі паважаю Яўгена Канстанцінавіча за яго добразычлівасць, ветлівую ўсмешку, падтрымнае слова. Яблычак, абавязкова антонаўку ("вы ж Антонаўна!"), сяброўскі шарж, пару вершаваных радкоў-парадаў, цэлы вялікі скрутак віншавальных прыпевак, гумар шырокай і шчырай душы, дудачка ўласнай вытворчасці і, вядома ж, песні на мае вершы- гэтыя каштоўныя падарункі спадара Яўгена з гонарам і ўдзячнасцю хаваю ў самай пашаноўнай скрынцы свайго хатняга архіва і душы.***

***Калі ён прыходзіць да мяне па творчых справах, настрой уздымаецца пасля нашай гутаркі на цэлы тыдзень - цяпла прыбаўляецца. Калі адбываецца чарговая сустрэча навучэнцаў каледжа з гэтым самабытным музыкантам і кампазітарам ці яго знакамітымі "Гарадзенскімі дударыкамі"- у каледжы свята.***

***Я.К. Петрашэвіч – Настаўнік і Паэт па жыццёваму прызначэнню. Усімі сваімі ўчынкамі, паводзінамі, стасункамі з людзьмі, успрыманнем свету ён вымушае нас быць лепшымі, больш цярплівымі і міласэрнымі.***

***Энергічны, вясёлы, прыгожы, мудры філосаф і сціплы, добры чалавек, абсалютна бескарысны і найсвядомейшы патрыёт сваёй радзімы - такім ведаю, такім успрымаю я нашага слыннага гарадзенскага Маэстра, нашага таленавітага Творцу Яўгена Петрашэвіча. І вельмі ўдзячна лёсу за тое, што некалі сутыкнуў мяне з ім на творчай ніве.***

**Людміла Антонаўна Кебіч,** намеснік дэрыктара па выхаваўчай рабоце УА "Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў", паэтэса, старшыня Гродзенскага абласнога адзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі

***

***Яўген Петрашэвіч... Для мяне ён быў, ёсць і будзе Яўгенам Канстанцінавічам. Успамінаю верасень 1954 года, калі я, вучань 2-га класа гродзенскай дзіцячай музычнай школы, першы раз прыйшоў на заняткі аркестра народных інструментаў. Сустрэў мяне тады, як і іншых, малады, з артыстычнай, як і сёння, прычоскай, і ветлівай, добразычлівай усмешкай кіраўнік аркестра Яўген Канстанцінавіч Петрашэвіч. Размеркаваўшы новенькіх аркестрантаў па інструментах (мне давялося іграць на самай маленькай домры-пікала), ён распавядаў нам, што такое аркестр, якія да нас будуць патрабаванні, што цікавае нас чакае.***

***А чакала нас сапраўды многа цікавага. Гэта і работа над разнастайным рэпертуарам, і гутаркі пра музыку і музыкантаў, і канцэртныя выступленні аркестра ў музычнай школе. Асабліва запомніўся выступ аркестра ў зборным святочным канцэрце на сцэне Гродзенскага педагагічнага інстытута імя Янкі Купалы (на жаль, не помню дакладна, што гэта было за свята і ў якім годзе). Ігралі мы тады з натхненнем і апладысментаў на нашу долю дасталося немала. Гэтаму поспеху, безумоўна, спрыялі апантанасць і прафесіяналізм у рабоце з аркестрам яго кіраўніка - Я.К. Петрашэвіча, яго ўменне не толькі словам, жэстам, але і позіркам падбадзёрыць, дапамагчы ўмацаваць упэўненасць ў сваіх сілах і, тым самым, дасягнуць станоўчых вынікаў.***

***У нашым аркестры ігралі і вучні Я.К. Петрашэвіча па класе баяна, на сённяшні дзень народныя артысты Рэспублікі Беларусь кампазітары Леанід Захлеўны і Віктар Войцік. Яны дзесьці з другога - трэцяга класа пачалі нешта самі ствараць, і Яўген Канстанцінавіч гэтую іх дзейнасць вельмі заахвочваў і дапамагаў разабрацца ў творчым працэсе стварэння музыкі, бо і сам меў і мае вялікія творчыя здольнасці.***

***Тут трэба дадаць, што ў тыя мае дзіцячыя гады адносіны ў нас былі самыя даверлівыя, усе дзеці ставіліся да настаўніка з вялікай павагай, ён для нас усіх быў узорам музыканта і чалавека. Не аднойчы мы цэлым гуртам пасля рэпетыцый аркестра праводзілі яго дадому (жыў ён тады на вуліцы Мулярскай). За гэты час, пакуль мы ішлі, ён распавядаў нам шмат цікавага пра навакольнае асяроддзе, пра розныя гістарычныя падзеі, пра Сусвет, пра цікавыя падзеі з жыцця музыкантаў, кампазітараў, дырыжораў і шмат пра што іншае. Такім чынам, будзіў жаданне ведаць пра ўсё як мага болей, як казаў паэт: "зваў з цемры да святла", за што я асабіста Яўгену Канстанцінавічу вельмі ўдзячны.***

***Пра тое, што Яўген Канстанцінавіч напісаў як кампазітар, пра яго работу ў ансамблі "Нёман", пра стварэнне і плённую работу з "Гарадзенскімі дударыкамі" музыканты нашага горада і вобласці добра ведаюць. Хачу дадаць, што дзіцячы ўзорны фальклорны ансамбль "Гарадзенскія дударыкі" шмат разоў выступаў (у розныя гады) на сцэне Гродзенскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў (былога культурна-асветнага вучылішча, пазней-вучылішча культуры, вучылішча мастацтваў), дзе я працую з 1971 года з нязменным поспехам.***

***Яўген Канстанцінавіч часты госць у нашых навучэнцаў. Асаблівая прыхільнасць у Яўгена Канстанцінавіча да навучэнцаў спецыяльнасці “фальклор”, бо ў іх асобе ён бачыць тых, хто будзе працягваць справу адраджэння народных святаў і абрадаў, музыкі і спеваў, хто будзе ствараць фальклорныя ансамблі на месцы працы пасля заканчэння вучобы ў каледжы. Так, напрыклад, чарговая сустрэча Яўгена Канстанцінавіча з нашымі навучэнцамі адбылася 24 мая 2006 года на адкрытай гадзіне куратара па тэме: “Уводзіны ў спецыяльнасць”. Вельмі цікавы расказ пра час і пра сябе выклікаў у навучэнцаў 270 і 277 вучэбных груп шмат пытанняў, на якія Я.К. адказаў, прыводзячы прыклады са свайго жыццёвага і творчага шляху.***

***Мяне асабіста вельмі радуе тое, што Яўгена Канстанцінавіча адразу і з вялікім энтузіязмам адгукнуўся на маю просьбу даць нам свае кампазітарскія опусы, каб мы маглі выкарыстоўваць іх у вучэбным працэсе. Упэўнены, што праз некаторы час асобныя творы будуць укючаны ў рэпертуар вучэбных фальклорных ансамбляў і прагучаць ў канцэртах і на дзяржаўных экзаменах, іншыя творы выканаюць нашы навучэнцы-цымбалісты. Мяркую, што большасць твораў будзе выкарыстана і на ўроках па інструментоўцы для фальклорнага ансамбля. Добра ведаю, што гэты творчы саюз Яўгена Канстанцінавіча з выкладчыкамі і навучэнцамі спецыяльнасці “фальклор” (якая ў каледжы адкрылася дзесяць гадоў таму і якую я ўзначальваю ўвесь гэты час) будзе ўмацоўвацца з кожным годам. Дарэчы, тое, што я звязаў свой лёс з музыкай, я лічу, гэта вынік уплыву і Яўгена Канстанцінавіча.***

***Пару гадоў таму я даведаўся, што, акрамя музыкі, Яўген Канстанцінавіч піша і вершы. І піша іх даўно, піша пра тое, што трывожыць, хвалюе, прымушае думаць пра людзей, якія яго акружаюць, пра лёс Радзімы, пра мясціны, дзе давялося пабываць, пра людзей, з якімі пазнаёміўся. З гэтых вершаў ужо склалася цэлая кніжка. Я вельмі задаволены тым, што Я.К. даверыў мне прачытаць гэтую кніжку і выправіць там памылкі друку. Спадзяюся, што ў хуткім часе кніжка вершаў Я.К. будзе надрукавана, і аматарам паэзіі вершы спадабаюцца.***

***Цікава ў асобе Яўгена Канстанцінавіча і тое, што самыя простыя, здавалася б, рэчы ён бачыць у сваім ракурсе, яго погляды заўсёды адметныя, арыгінальныя, своеасаблівыя. Але самае, на мой погляд, галоўнае ў асобе Яўгена Канстанцінавіча - яго шчырая, сыноўняя любоў да нашай Радзімы, да Бацькаўшчыны, цікаўнасць да жыцця ва ўсіх яго праявах.***

***Шчыра жадаю Яўгену Канстанцінавічу моцнага здароўя, бадзёрасці, аптымізму і далейшых творчых поспехаў ва ўсіх галінах яго дзейнасці.***

14.06.06 г.

**Іван Сцяпанавіч Нашкевіч, выкладчык, старшыня цыклавай камісіі фальклору УА “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”, былы вучань Я.К. Петрашэвіча.**

На імя Госпада прашэнне
Пішу, як Пімен, на ўскасн:
„Зрабі, каб Жэня Петрашэвіч
Не абмалочваў „Каласы".

Юрка Голуб
18.06.2005.

Музыка

Ішоў палянай свістунчык
Пад дудку прыгалі дубкі.
Аблокі здзіўлена стаялі.
А травы сталі на дыбкі.

І прад усім да паднябесся
Свой голас нёс птушыны гурт.
Сябе нікомі ён не збярог,
Наадварот паглыбіў гурт.

І з надзвычайнай нагоды
Пад зоркі колішняй красы
Гатовы ўсе, куды заўгодна,
Крылатых шыхтаў галасы.

А іх любілі, шанавалі,
І кожны міляў іх на ўвеку,
Хацця і зорак ёсць навалам,
А нашы птушкі – пад руку.

А цюцька, ведама, прышэлец,
Абгаўкаў птушыны караван.
Дык спраўна з дудкай Петрашэвіч
Харалам птушак кіраваў.

9.01.97

Ю.Г.

Голуб Юра

Успаміны.

Нашы матулі сябравалі. У маёй маці, часта бывала ў вашай сям'і. А потым яна расказвала пра Вас і вашу сястру. А тады меў мала вольнага часу і не сустракаў, суправаджаў маці да вас, хоця яна неаднаразова мяне запрашала, бо займаўся ў Вузе.
Мы з маці захапляліся вашым учынкам і гаварылі, што ёсць мужныя людзі, каторыя ігнаруюць мнение савецкіх улад. У "Чысты чацвер" перад Пасхай, вы выходзілі з храма з свечкай і неслі яе да дому.
А цяпер я расказаў гэта ксяндзу, прыкладна год 5-6 назад. І мы кожны Чысты чацвер перад Пасхай успамінаем гэты ваш учынак, смелага чалавека і патрыёта нашай Бацькаўшчыны і нашчадка Традыцый нашых продк

З павагай Міхаіл Валковіч.

Тел. 74-13-74.

* * *

От звезды до родного порога,
Как волшебный, немеркнущий свет,
Льется музыка словно от бога
Для тебя, музыкант и поэт.
Только надо светло и ранимо
Через душу ее пропустить –
Засияет глазами любимой,
И захочется сердцу любить.
И откроется в небо дорога,
На земле станет больше путей,
По которым идти педагогам
И вести за собою детей.
Так приходят большие таланты,
С ними песня, что вечно в строю.
И берутся тогда музыканты
За трубу, за гитару свою.
Вот на сцене шикарной ребята –
У девчат разбежались глаза:
Все румяны, стройны, как солдаты –
Вот смычками качнут небеса.
Всем приветы раздарят кларнеты,
А кого-то потянет на сон –
Чтобы зиму не путали с летом,
То разбудит его саксафон.
Песня та – что вам крылья подарит,
Словно – молния через года.
Душу ты отведешь при гитаре,
А гитара – всегда молода.
Если любишь сонаты и ~~[illegible]~~ скерцо,
Не томись ты тоской голубой –
На свидание с девушкой сердца
Позовет говорливый гобой.

**Міхась Губернатараў**

## 9. Бібліяграфія


1. Васілевіч, М. Ансамблю “Дударыкі” - 10 гадоў / М. Василевіч// Літаратура і мастацтва. - 1998. - 29 мая. - С. 3.
2. Вёсачка мая, чараўніца: [песня] / сл. Цёткі, муз. Я. Петрашэвіча // Гродзенская праўда. - 1996. - 17 вер.
3. Голуб, Ю. А малы каляднічак пагуляць ахвотнічак! / Юрый Голуб // Гродзенская праўда. - 2001. - 6 студзеня. - С. 5.
4. Губернатараў, М. “Спяваць - як напіцца крынічнай вадзіцы...”: [гродз. кампазітару Яўгену Петрашэвічу – 70 гадоў] / Міхась Губернатараў // Гродзенская праўда. - 2000. - 10 чэрв. - С. 3.
5. Губернатараў, М. Дыхае песняй / Міхась Губернатараў // Гродзенская праўда. - 2005. -18 чэрв. - С. 12.
6. Губернатараў, М. Музыка - сэнс яго жыцця / Міхась Губернатараў // Перспектива. -2005. - №52. - 12 июля. - С. 5.
7. Задаля, В. Яго экспедыцыі і “Купалле-русалле”/ В. Задаля // Культура. - 2005. -№26. - 25 чэрв. - 1 ліп. - С. 12.
8. Кебіч, Л. “Сцежкі добрыя, як усмешкі”/ Л. Кебіч // Беларуская думка. - 2006. - № 5. - С. 154-155.
9. Лабовіч, А. Яго песні, як і ён сам, з народу / Антон Лабовіч; фота // Биржа информации. - 2004. - 23 вер. - С. 17.
10. Лаўріновіч, Д. Дударыкі / Д. Лаўріновіч // Гродненская неделя. - 1993. - 11 мая. - С. 1-2.
11. Маразевіч-Іоська, С. “За морем житьё не худо” / С. Маразевіч-Іоська // Аркуш. - 2000. - С. 2.
12. Маразевіч-Іоська, С. Нарвежскія гастролі “Дударыкаў” / С. Маразевіч-Іоська // Пагоня. - 2000. - 31 жн. - С. 3.
13. Нікановіч, В. “Сто лят!” / В. Нікановіч // Пагоня. - 1997. - 6-12 чэрв.- С. 7.
14. Петрашэвіч, Я. Батлеемская зорка: [песня] / Я. Петрашэвіч // Аркуш. - 2004. - 14-20 янв. - С. 2.
15. Петрашэвіч, Я. “Беларускія музыкі спадабаліся ў Францыі” / Я. Петрашэвіч // Гродзенская праўда. - 1995. - 14 вер. - С. 3.
16. Петрашэвіч, Я. Гродна, родны мой горад: [ песня] / Я. Петрашэвіч // Гродзенская праўда. - 1997. - 12 жн. - С. 3.
17. Петрашэвіч, Я. “Гэй, Каляда, Калядзіца!”: [песня] / Я. Петрашэвіч // Аркуш. - 2001. - №2. - С. 3.
18. Петрашэвіч, Я. Душы патаемныя дзверы: [вершы] / Яўген Петрашевіч // Галасы: штогоднік. Вып 3 / уклад. Ю.У. Голуб. - Гродна, 2004. - С. 150-151.
19. Петрашэвіч, Я. Душы патаемныя дзверы: [вершы] // Гродзенская праўда. - 2003. - 8 крас. - С. 3.
20. Петрашэвіч, Я. Ідзе, ідзе каляда: [песня] // Гродзенская праўда. - 2001. - 6 студз. - С. 5.
21. Петрашэвіч, Я. Каб не адмірала душа...: [гутарка з гродз. кампазітарам, кіраўніком фальклорнага ансамбля “Гарадзенскія

дударыкі" Я. Петрашэвічам] / гутарыла Л. Якшук; фота // Биржа информации. - 2002. - 25 апр. - С. 6.
22. Петрашэвіч, Я. Купалле: [верш] / Я. Петрашэвіч // Аркуш. - 2001. - 9-14 авг. - С. 3.
23. Петрашэвіч, Я. Купальскай ночкай патайной: [песня] / Я. Петрашэвіч // Гродзенская праўда. - 2004. - 12 чэрв. - С. 11.
24. Петрашэвіч, Я. Маме: [верш] // Гродзенская праўда. - 2003. - 6 снеж.- С. 16.
25. Петрашэвіч, Я. Не пакінь, Яўген, гармонік...: [гутарка з педагогам і кампазатарам Я.К. Петрашэвічам] / гутарыў В. Задаля; фота // Культура. - 2002. - 10-16 жн. - С. 12.
26. Петрашэвіч, Я. Прыйшла каляда: [песня] / Я. Петрашэвіч // Гродзенская праўда. - 2003. - 4 студз. - С. 12
27. Петрашэвіч, Я. Прыляталі жаваронкі: [песня] / Я. Петрашэвіч // Аркуш. - 2004. - 17-23 марта. - С. 2.
28. Петрашэвіч, Я. Прыляталі жаваронкі: [песня] / Я. Петрашэвіч // Гродзенская праўда. - 2004. - 18 сак. - С. 8.
29. Петрашэвіч, Я. Радуйся, Купалінка: [песня ] / Я. Петрашэвіч // Аркуш. - 2004. - 14-20 июля. - С. 2.
30. Петрашэвіч, Я. Роднай сястры Ірыне. Як вяночак роспачы на 40 дзён: [верш ] // Пагоня. - 2000. - 7 снеж. - С. 8.
31. Петрашэвіч, Я. Сок зямлі: [верш ] // Гродзенская праўда. - 2003. - 3 чэрв. - С. 3.
32. Петрашэвіч, Я. Спяваць - як напіцца крынічнай вадзіцы...: [гутарка з гродз. кампазітарам Я. Петрашэвічам] / гутарыў М. Губернатараў; фота // Гродзенская праўда. - 2000. - 10 чэрв. - С. 3.
33. Петрашэвіч, Я. Хвіліна маўчання: [песня] / сл. Я. Насуты; муз. Я. Петрашэвіча // Аркуш. - 2004. - 19-25 мая. - С. 2.
34. Петрашэвіч, Я. Навасёлы: [верш ] / Я. Петрашэвіч // Гродзенская праўда. - 2004. - 4 мая. - С. 7.
35. Родионов, В. "Музыка - маё жыццё» / В. Родионов // Аркуш. - 2000. - 10-16 авг. (№32). - С. 2.
36. Родионов, В. Музыка-маё жыццё: [аб Гродзенскам кампазітары Я. Петрашэвічы і яго дзейнасці] / В. Родионов // Аркуш. - 2000. - 10-16 авг. - С. 1,2.
37. Сіневіч, А. Музыка дае маладосць: [пра гродз. кампазітара Я. Петрашэвіча да яго 70-годдзя] / А. Сіневіч // Пагоня. - 2000. - 8 чэрв. - С. 8.
38. Станеўская, Л. "Гарадзенскія дударыкі" / Л. Станеўская // Мастоўская раённая газета. - 2003. - 26 сак. (№31). - С. 2.
39. Юнчык, Л. Як "Гарадзеньскія дударыкі" разбурылі нарвежскую скалу / Леанід Юнчык // Рэспубліка. - 2000. - 3 кастр. - С. 7.
40. Юнчык, Л. Как «Дударики» лёд растопили» Л. Юнчык // Качели. - 2001. - №3. - С. 10.
41. Якшук, Л. "Каб не адмірала душа..." / Л. Якуш // Биржа информации. - 2002. - 25 апр.– С. 6.

**Складальнік: Сотнікава Іна Вісарыёнаўна**
**Рэдактар:Свірыда Наталля  Рыгораўна**
**Камп'ютэрная вёрстка: Свірыда Н.Р.**

Адрас Гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А. Макаёнка: вул.Сав. Пагранічнікаў, 51/2,
тэл. 52-14-06